## ДОМА МАМЕ ПАМАГАЦЬ — НЕ РУКАМІ ПАМАХАЦЬ *(Рыгор Барадулін)*



— Васілінка, выйдзеш гуляць? — гукнуў дзяўчынку Лянок.

— Не магу! Трэба маме дапамагчы, — адказала Васілінка. — Яна зараз сястрычку пераапранае.

— А мне дазволілі пакатацца на веласіпедзе. Хочаш, дам табе пакатацца? — не сунімӑўся Лянок.

Як вы думаеце, пойдзе Васілінка гуляць ці застанецца дапамагаць маме? Як бы вы паступілі на яе месцы?

Пісягí — *тут*: брудныя сляды на стале.

Паслухайце верш і скажыце, ці парадуецца маці такой дапамозе.

## Памочніца

*Галіна Каржанеўская*



Ледзьве мама ў кватэру —
Да яе спяшае Вера
І дакладвае ёй з ходу
Пра вялікую работу.
— Я вячэру згатавала!
(У муцэ чамусьці зала.)
— Стол я выцерла! (Але
Пісягі на тым стале.)
— Я мяла, як ты вучыла!
(У куце мятлу забыла.)
— Я памыла сарафан!
(У ванне — мора-акіян.)
— Вось якая я чысцюля!
...Разгубілася матуля.
Думу думае: як быць?
Ці хваліць, ці не хваліць?

1. Пра што паведаміла маме Вера?
2. Прачытайце, якія справы па хатняй гаспадарцы рабіла Вера і што з гэтага выйшла.
3. Чаму матуля разгубілася? За што можна пахваліць дзяўчынку? Якія парады ёй даць?
4. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша.
5. Растлумачце сэнс прыказак.

- Дзе рукі і ахвота — там вялікая работа.
- Акуратная работа акуратных людзей любіць.



Разгледзьце малюнак. Прачытайце назву апавядання. Як вы думаеце, якая гісторыя адбылася? Прачытайце твор і параўнайце са сваім меркаваннем перад чытаннем.



Ла́зенька — *тут*: ванны пакой.
Шпале́ры — *рус.*: обои.
З перапу́ду — *рус.*: от испуга.

## Мышка Пік-Пік прыбірае норку

*Людміла Рублеўская*

(Урывак з аповесці-казкі
«Прыгоды мышкі Пік-Пік»)

Летам у кватэры, дзе жыла мышка, адбыўся вялікі рамонт. Пік-Пік ледзь перажыла гэтую страшэнную навалу — цэлы тыдзень у доме пахла фарбамі, тупалі незнаёмыя людзі, мэблю перасоўвалі з месца на месца. Асабліва цяжка было прабірацца на кухню. Але ўрэшце ўсё скончылася, і кватэра зрабілася вельмі прыгожай: падлога блішчыць, столь — бялю́сенькая, на сценах — новыя шпалеры.

Пахадзіла мышка па абноўленых пакоях, пазайздросціла гаспадарам. Вярнулася ў сваю норку і ледзь не заплакала: якое, аказваецца, бруднае і неўладкава́нае яе жытло! Усё шэрае, пыльнае, на падлозе тоўсты слой смецця: агрызкі, шалупі́нне семачак,

цукерачныя абгорткі, шматкі газет. З усяе мэблі — толькі ложак — цукерачная каробка.

— Нічога не зробіш, давядзецца прыбіраць! Ніколі раней на гэты сумны занятак мышка часу не марнавала. «Здаецца, галоўнае — вымыць падлогу. Але насіць у норку ваду цераз усю кватэру... Калі мышка не ідзе па ваду, вада сама павінна прыйсці да мышкі», — мудра падумала Пік-Пік.

Усе ў доме спалі. Мышка збегала на кухню і ў лазеньку, адвярнула краны і, паназіраўшы, як вада запаўняе ванну і мыйку, пайшла спаць.

Прачнулася мышка ад холаду. Расплюшчыла вочы і ўбачыла над сабой столь, якая чамусьці хісталася. Цукерачная каробка — ложак — пагойдвалася пасярод пакоя на хвалях!

— Гвалт! — шэптам сказала мышка, бо голас у яе знік з перапуду.

На шчасце, прачнуўся тата і захацеў надзець пантофлі, якія даўно сплылі ў другі кут пакоя. Татавы ногі апусціліся ў халодную ваду... Ад татавага ўскры́ку прачнуліся

ўсе: і мама, і Веранічка, і кошка Пепіта. Веранічка засмяялася і пачала бегаць па вадзе і ганяць з кута ў кут пантофлі, як маленькія караблі. Мама пабегла перакрываць краны, а тата стаяў босымі нагамі ў вадзе і шаптаў:

— Гэта канец свету! Вялікі патоп!

Між тым мама перакрыла краны і сабрала анучай з падлогі ваду. Пантофлі і мышкін ложак перасталі пагойдвацца на хвалях, але кватэра не была больш такой чыстай і прыгожай: з мышкінай норкі вымылася столькі смецця, што яно забру́дзіла ўсю кватэру.

Мама пачала высвятляць, хто адкрыў краны, і мышка схавалася ў норку. Там было мокра, але незвычайна чыста. Да таго ж адзін з татавых пантофляў заплыў у норку, і мышка прызначыла яго сваёй канапай.

1. Чаму мышка Пік-Пік вырашыла прыбраць у сваёй норцы?
2. Што здарылася з норкай мышкі, пасля таго як яна адкруціла краны з вадой і пайшла спаць?
3. Як бы вы растлумачылі мышцы, што трэба асцярожна абыходзіцца з водаправоднымі кранамі і берагчы ваду?